БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта, 12 лютага 1998 года, чацвер, № 2 (1775)

А ў вас? А ў нас!

Шклянка медавухі з рук рэктара

Сваю 243-ю гадавіну святкаваў 25 студзеня Маскоўскі дзяржаўны універсітэт імя М. В. Ламаносава. Указ аб заснаванні універсітэта быў падпісаны царыцай Елізаветай Пятроўнай у 1775 годзе, у дзень святой Таццяны па праваслаўнаму каляндару. Вось ужо на працягу амаль двух з паловай стагоддзяў, з часу заснавання да сённяшніх дзён, 25 студзеня — галоўная дата для МДУ. У гэтым годзе ў актавай зале галоўнага будынка МДУ на Вараб'ёвых гарах адбылося пашыранае пасяджэнне Савета навуковых Саветаў. На сустрэчы прысутнічалі прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса, рэктар духоўнай акадэміі, ганаровыя госці з усіх рэгіёнаў Расіі і краінаў СНД. Па традыцыі перад адкрыццём пасяджэння пад спеў студэнцкага гімна „Гаўдэамус" заносяцца рэліквіі МДУ. Паколькі святкуецца Таццянін дзень, то ў ліку запрошаных у прэзідыуме прысутнічаюць Таццяны — студэнткі універсітэта. З урачыстай прамовай выступіў рэктар універсітэта В. А. Садоўнічы, які павіншаваў усіх прысутных са святам. Потым з віншаваннем выступіў міністр замежных спраў Расіі Яўген Прымакоў, якому ўручылі медаль ганаровага прафесара МДУ. Пасля афіцыйнай часткі пачаўся святочны канцэрт з удзелам тэатра МДУ.

У суботу, 24 студзеня, праходзіла пасяджэнне Савета МДУ ў будынку корпуса на вуліцы Махавой, дзе адбылося ўручэнне Шувалаўскіх і Ламаносаўскіх прэміяў вядучым навукоўцам універсітэта. Пасля гэтага ў галоўным будынку МДУ адбылося святочнае шоў з нагоды дня святой Таццяны. У холе, дзе праходзіла першая частка шоў, было шматлюдна, бо толькі раз на год студэнтам выпадае магчымасць атрымаць з рук рэктара шклянку медавухі...

Сяргей ДЗІЕСПЕРАЎ,
старшыня Студэнцкага саюза БДУ

Аб'ява

Ліцэй Белдзяржуніверсітэта

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад настаўнікаў:

- *матэматыкі (2);*
- *прыродазнаўчых навук (біялогія - 1, геаграфія - 1, хімія - 2);*
- *фізічнага выхавання (5);*
- *харэаграфіі (1).*

Тэрмін конкурсу - 1 месяц з дня апублікавання.

Адрас: г. Мінск, вул. Маякоўскага, 96, тэл. 221-04-10

Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы пры БДУ аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад прафесарска-выкладчыцкага складу:

- загадчыка кафедры тэхналогій адукацыі;
- прафесара кафедры філасофіі і культуралогіі;
- дацэнтаў кафедры паліталогіі і сацыялогіі;
- старшага выкладчыка кафедры паліталогіі і сацыялогіі.

Тэрмін падачы дакументаў — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.
Дакументы накіроўваць на адрас:
220001, г. Мінск, вул. Маскоўская, 15, аддзел кадраў.
Тэл. 222-83-15.

Выставы

Музею гісторыі БДУ — 20 год

На трэцім паверсе галоўнага корпуса ў памяшканні бібліятэкі Белдзяржуніверсітэта ладзіцца фотавыстава, прысвечаная 20-годдзю музея гісторыі БДУ.

Амаль адразу пасля адкрыцця універсітэта на пачатку 20-х гадоў узнікла ідэя аб стварэнні гістарычнага музея ў БДУ. Па ініцыятыве прафесара М. В. Доўнар-Запольскага і пры ўдзеле выкладчыка С. З. Кацэнбогена Управа БДУ закупіла копіі старажытнагрэчаскіх і старажытнарымскіх статуй, масак, вазаў, зробленых у Эрмітажы ў Петраградзе. Па водгуках спецыялістаў, яны амаль не адрозніваліся ад арыгіналаў. Так была складзена экспазіцыя музея старажытнай культуры і рэлігіі, які быў адчынены 1 сакавіка 1924 года. Дарэчы, уваход у музей тады быу платным. З перыядычных выданняў таго часу можна даведацца — "з кожнага удзельніка экскурсіі па 5 капеек, з адзіночных наведвальнікаў членаў прафсаюзаў — 10 капеек, з астатніх — 20."

На фотаздымку: у музеі гісторыі БДУ. 1997 год.

Зразумела, што з цягам часу музей папаўняўся новымі экспанатамі. Асабліва ў канцы 20-х — на пачатку 30-х гадоў, калі ў яго траплялі знаходкі археалагічных і этнаграфічных экспедыцый, якія праводзіліся гісторыкамі і краязнаўцамі. Так, загадам рэктара П. П. Савіцкага 10 студзеня 1940 года быў створаны гісторыка-археалагічны музей. На жаль, усе калекцыі і фонды гэтага музея загінулі падчас II Сусветнай вайны.

На пачатку 50-х гадоў паўстала неабходнасць стварыць падраздзяленне, якое б займалася захаванням і зборам інфармацыі па гісторыі універсітэта. Усю пошукавую працу ўзялі на сябе выкладчыкі і студэнты гістарычнага факультэта. Вялікую працу па стварэнню музея правялі супрацоўнікі гістфака І. О. Царук, Г. І. Даўгяла, М. Ф. Піліпенка, В. Н. Рабцэвіч, А. А. Стуканаў, А. А. Яноўскі і інш. У 1971 годзе быў адчынены пакой падарункаў, што атрымаў універсітэт. А ў снежні 1977 года па ініцыятыве рэктара А. У. Сікорскага быў створаны аддзел гісторыі БДУ гістарычнага музея універсітэта.

У 1993 годзе ў сувязі з перамяшчэннем гістарычнага факультэта ў іншы будынак музей перапыніў сваю працу. З ліпеня 1995 года пачалася праца па яго рэканструкцыі, і музей стаў агульнауніверсітэцкім. Дарэчы, калекцыі і фонды музея ўключаюць у сябе больш за 10 тысяч адзінак. У адноўленым выглядзе ён працаваў каля года. Па словах загадчыка музея Артура Зельскага, за гэты час музей прыняў вялікую колькасць наведвальнікаў — каля 1000 чалавек. Зараз музей гісторыі БДУ ізноў знаходзіцца на рэканструкцыі.

Таццяна КУХАРЧУК

Міжнародная арбіта

Універсітэт інтэгрыруецца ў свет

2 лютага ў галоўным корпусе БДУ адбылося пасяджэнне Савета універсітэта. Асноўнае пытанне, якое абмяркоўвалася на Савеце, — стан і перспектывы развіцця міжнароднай дзейнасці Белдзяржуніверсітэта. Сведчанне актуальнасці закранутай тэмы — рашэнне аб скліканні ў кастрычніку 1998 года пад эгідай ЮНЕСКО сусветнай канферэнцыі па вышэйшай адукацыі. Міжнародны форум павінен вызначыць схему дзеяння ўсіх дзяржаў у сферы адукацыі ў XXI стагоддзі. На сённяшні дзень вылучана чатыры прыярытэтныя напрамкі: адраснасць адукацыі, фінансы і менеджмент, якасць, а таксама інтэрнацыяналізацыя і міжнароднае супрацоўніцтва.

Усім зразумела, што ні сістэма адукацыі, ні канкрэтныя ВНУ не могуць замкнуцца ў сабе, а наадварот, павінны быць максімальна адкрытымі для міжнароднага супрацоўніцтва. І ад гэтага таксама залежаць і імідж навучальнай установы, і ўзровень падрыхтоўкі спецыялістаў, і , у выніку, яе прэстыж. Наш карэспандэнт сустрэўся з прарэктарам па міжнародных сувязях Уладзімірам Аркадзьевічам Астапенкам, які і выступаў на савеце з асноўным дакладам.

— Якія ж прыярытэты ў міжнароднай дзейнасці можна вылучыць на універсітэцкім узроўні?

— Рыхтуючы гэтае пытанне на разгляд Савета, мы імкнуліся па магчымасці комплексна і ўсебакова прааналізаваць менавіта мясцовы стан спраў. У сферы міжнароднай дзейнасці ва універсітэце выдзяляюцца тры асноўныя напрамкі: навучанне замежных студэнтаў, якія пажадаюць атрымліваць у нас адукацыю, узаемадзеянне з ВНУ-партнёрамі ў рамках двухбаковых пагадненняў і работа па міжнародных адукацыйных праграмах. Папярэдне быў дэталёва вывучаны існуючы стан спраў на кожным факультэце і цалкам ва універсітэце. Сабраныя статыстычныя звесткі дазволілі зрабіць аналіз тэндэнцый, якія назіраюцца зараз. На разгляд Савета былі вынесены прапановы па далейшых кроках у гэтых накірунках.

Калі пачынаць гаварыць аб рабоце з замежнымі студэнтамі, дык апошнім часам, на жаль, даводзіцца канстатаваць даволі рэзкае падзенне іх колькасці.

— Колькі замежнікаў зараз атрымліваюць адукацыю ў нашым універсітэце?

— Крыху больш за сто з паўтара дзесятка краін свету. Бясспрэчны лідэр тут — факультэт міжнародных адносінаў, дзе навучаецца 48 замежнікаў. У пачатку дзевяностых гадоў спіс краінаў, грамадзяне якіх атрымлівалі адукацыю ў нас, налічваў больш за 50. Тлумачыцца такая змрочная сітуацыя даволі проста. Практычна тыя ж тэндэнцыі назіраюцца ў іншых навучальных установах не толькі ў Беларусі. У 1990 годзе расійскія вышэйшыя навучальныя ўстановы карысталіся попытам у 120 тысяч замежных студэнтаў, а амерыканскія — у 300 тысяч. Статыстыка ж 1996 года сведчыць, што ў Расіі навучаліся 60 тысяч замежных студэнтаў, а ў ЗША — 400 тысяч. Пасля таго, як на пачатку 90-х гадоў зруйнавалі старую сістэму адбору студэнтаў, новую пакуль ніхто не пабудаваў. Кожны выкараскваецца як можа. На вялікі жаль, і сёння гэтая тэндэнцыя захоўваецца. Хаця ўсе факультэты заявілі аб сваёй зацікаўленасці ў правядзенні такой работы, і яны маюць рацыю. Дастаткова прыкладаў таго, як высока нашых выпускнікоў ацэньваюць у іншых краінах. І узровень якасці адукацыі, якога мы дасягнулі, ні ў каго не выклікае сумненняў.

(Пачатак. Заканчэнне на 2-й старонцы).

Універсітэт інтэгрыруецца ў свет

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

— Чаму ж тады няшмат ахвотных з-за мяжы атрымаць адукацыю ў нашым універсітэце, і як, на ваш погляд, будзем выкарасквацца з гэтай сітуацыі мы?

— Перш за ўсё актывізуем работу па знешняму маркетынгу: патрэбна максімальна прадставіць універсітэт у краінах, дзе можна адшукаць патэнцыяльных абітурыентаў. Тут нам непазбежна давядзецца канкурыраваць з еўрапейскімі і амерыканскімі універсітэтамі. Навучанне ў Беларусі абыйдзецца танней. У той жа час па якасці ніколькі не горшае. Не стае толькі належным чынам арганізаванай рэкламы універсітэта, старонкі ў Internet, да якой маглі б звяртацца ўсе жадаючыя, адраснай работы з былымі выпускнікамі, праз якіх магчыма распаўсюджваць інфармацыю аб БДУ.

Патрэбна таксама палепшыць побытавыя ўмовы пражывання навучэнцаў. Мы прапанавалі таксама ўвесці стыпендыі для замежнікаў. Гэта было б дадатковым стымулам і стварыла б канкурэнцыю за месца ў нашым універсітэце.

— Што ж датычыць замежных ВНУ-партнёраў, дык мне здаецца, што іх не так ужо і мала...

— Але многія пагадненні, якія заключаліся яшчэ ў савецкія часы і ў першыя гады незалежнасці рэспублікі, аказаліся недзеяздольнымі па розных прычынах. Па-ранейшаму працуюць партнёрскія праграмы з Йенай, Бохумам, нашымі польскімі калегамі. На жаль, гэта ўсё, чым можна пахваліцца. Калі мы аналізавалі сітуацыю, высветлілася, што міжнародныя сувязі ва універсітэце складваліся бессістэмна. Яны завязваліся ў залежнасці ад выпадковых візітаў прадстаўнікоў заходнееўрапейскіх, амерыканскіх і азіяцкіх навучальных устаноў. Пералік пагадненняў уражвае, але кожнае з іх трэба перагледзець і пабудаваць новую формулу ўзаемадзеянняў. Думаю, што найперш будзем супрацоўнічаць з суседнімі дзяржавамі: Польшчай, Латвіяй, Літвой, Расіяй, не адмаўляючыся, вядома, ад узаемаадносінаў з іншымі. Але ж пагадненне з універсітэтам-партнёрам будзе жывым і дзейсным толькі тады, калі яго будуць падтрымліваць і развіваць канкрэтныя кафедры і факультэты. Адміністрацыйна прымусіць сябраваць і сумесна працаваць — немагчыма. У адным з пунктаў прапанаванага на разгляд Савета рашэння падкрэслівалася важнасць арганізацыі студэнцкіх стажыровак у рамках узаемадзеяння з замежнымі ВНУ. Пакуль сталымі сувязямі могуць пахваліцца толькі міжнароднікі, якія падтрымліваюць праграму абмену з нямецкімі ВНУ-партнёрамі.

— Што ўяўляюць сабой міжнародныя адукацыйныя праграмы, у якіх ужо ўдзельнічае універсітэт?

— У апошнія гады універсітэт актыўна ўдзельнічаў у пяці праектах праграмы TEMPUS, у той час, калі іншыя ВНУ Беларусі мелі ў ёй адзін, максімум два праекты, бо конкурс заўсёды вельмі вялікі. Жадаючых атрымаць гранты нашмат болей, чым магчымых вакансій. Перамагае той, чыя заяўка на ўдзел у праекце аказалася больш аргументаванай. З дапамогай гэтай міжнароднай праграмы закуплена вялікая колькасць абсталявання, уведзена спецыяльнасць "Інфармацыя і камунікацыя", распрацоўваецца пытанне аб адкрыцці спецыялізацыі па гаспадарчаму праву на юрыдычным факультэце. Карысць даволі адчувальная. Зразумела, што трэба працягваць такое супрацоўніцтва і пашыраць далей кола нашых партнёраў. У 1997 годзе рэктар універсітэта сустрэўся з кіраўніцтвам Еўрапейскай камісіі ў Бруселі. Вынікам стала адкрыццё ў нас Цэнтра еўрапейскай інфармацыі і дакументацыі. З праграмай развіцця ААН універсітэт падпісаў ужо два пагадненні. На аснове аднаго з іх ва універсітэце быў адчынены клас Internet, на аснове другога — Цэнтр па вывучэнню ААН. Зараз мы рыхтуем новыя праекты да чарговага цыклу TEMPUS і займаемся пошукам новых праграмаў: двухбаковых паміж універсітэтамі, рэгіянальных урадавых, праграмаў тэхнічнай дапамогі, якія рэалізуюцца праз розныя фонды.

Савет прызнаў неабходным наладзіць узаемадзеянне факультэтаў з універсітэцкай службай міжнародных сувязяў, каб на аснове іх супрацоўніцтва працаваць больш эфектыўна.

— Для таго, каб доўгі шлях стаў паспяховым, патрэбна зрабіць спачатку ўдалыя першыя крокі. З чаго пачне міжнародная служба універсітэта?

— Прыярытэтныя задачы — распрацоўка сучасных рэкламных матэрыялаў аб універсітэце, узаемадзеянне з міжнароднымі арганізацыямі накшталт ААН, ЮНЕСКО, Савета Еўропы...

Марына АВЕРКІНА

У дапамогу даследчыку

Многія матэматыкі, дый не толькі яны, зведалі непрыемнае пачуццё, якое ўзнікае падчас неабходнасці набраць на камп'ютэры навуковую працу (дыпломную, лабараторную), рукапіс якой літаральна ўсеяны ўсімі магчымымі формуламі, дыяграмамі, графікамі... Сёння, зразумела, няма праблемы з тым, як стварыць тэкст, асобна згенерыраваць неабходныя графікі ці формулы, а потым з дапамогай мудрагелістых праграмаў сумясціць усё гэта ў адным дакуменце. Але згаданае непрыемнае пачуццё менавіта з гэтым і звязана: патрабуецца выконваць даволі руцінную працу па ўвядзенню формулаў з дапамогай часта не зусім зручных, а здараецца, і наравістых формульных рэдактараў. Акрамя таго, патрэбна, выкарыстоўваючы спецыяльныя матэматычныя праграмы, стварыць адлюстраванне і перанесці яго ў асяроддзе тэкставага працэсара. Пры гэтым матэматычна вывераны аб'ект звычайна патрабуе пераўтварэння ў фармат кропкавага малюнка і крыху губляе якасць, не гаворачы ўжо пра страту ўсялякага кантролю над малюнкам.

Увагу зацікаўленых асобаў хочацца звярнуць на пакет Scientific WorkPlace, створаны амерыканскай кампаніяй TCI Software Research. Гэтую распрацоўку айчынныя карыстальнікі ведаюць ужо больш за два гады і з поспехам выкарыстоўваюць падчас афармлення электронных варыянтаў навуковых працаў.

Scientific WorkPlace спалучае нескладаны ў карыстанні тэкставы працэсар, які выкарыстоўвае фарматныя асаблівасці TEX і магчымасці лічбавых і сімвальных вылічэнняў, а таксама графічныя якасці сістэмы камп'ютэрнай алгебры Maple V. Такім чынам, карыстальніку няма неабходнасці засвойваць TEX, LATEX ці асобна падключаць Maple. Усе матэматычныя знакі, формулы і адлюстраванні ствараюцца ў дакуменце Scientific WorkPlace .

Праграма падтрымлівае ўсе Windows-сумяшчальныя друкаваныя прыстасаванні, мае ўбудаваныя рэдактары стыляў, табліцаў і магчымасці для фарматавання графікаў. Падчас правядзення вылічэнняў можна з лёгкасцю выкарыстоўваць ужо атрыманыя вынікі для фармавання новых.

Усё гэта робіць магчымым самае натуральнае спалучэнне тэкста і матэматычных выкладак у выніковым дакуменце.

Для работы з Scientific WorkPlace неабходныя MS Windows 3.1 і вышэй, 8 Мб аператыўнай памяці і 30 Мб на цвёрдым дыску.

С.ЗЯМСКОЎ, Цэнтр інфармацыйных тэхналогій

Усе на кірмаш

26 лютага ў Белдзяржуніверсітэце адбудзецца мерапрыемства, якое павінна падрыхтаваць студэнцкую моладзь да самастойнага выхаду на рынак працы — Кірмаш вакансій.

Мерапрыемства абяцае быць дастаткова цікавым па зместу. Для ўдзелу ў ім запрошаныя дзяржаўныя і камерцыйныя прадпрыемствы і ўстановы, якія прапануюць працу студэнцкай моладзі. Сярод іх "Белдзяржстрах", "Белканстрах", ААТ "БСК" СЕ, "Альвена", рэкламныя агенцтвы "Франтон", "Гударт", ААТ "Пасторг" (сетка крамаў), "Мекан" (оптавы гандаль і вытворчасць рэкламнай прадукцыі), "Чаша дружбы" (праца за мяжой), "Гіноўкер і Цішук" (вытворчасць цацак дома), СП "Дзіёрт" (вытворчасць мяккай цацкі і надомная праца). На кірмашы вакансій будзе арганізавана праца юрыстаў, псіхолагаў, прафкансультантаў. Плануецца дэманстрацыя відэафільмаў аб розных спецыяльнасцях. Са студэнтамі будуць працаваць спецыялісты гарадской службы занятасці.

Як заўважыў член аргкамітэту Аляксандр Лагімахаў, падобнае мерапрыемства у Белдзяржуніверсітэце праводзіцца ўпершыню. Мы спадзяемся, што такія ярмаркі вакансій для студэнцкай моладзі стануць рэгулярнымі, таму што менавіта ВНУ рыхтуюць найбольш патрэбныя кадры для ўстаноў і прадпрыемстваў рэспублікі.

Ад ідэі да вытворчасці доўгі шлях

11 лютага па прапанове папы Рымскага Іаана Паўла II увесь свет адзначыў дзень хворых. З гэтай нагоды карэспандэнт "Беларускага універсітэта" сустрэўся з загадчыкам лабараторыі біяхімії лекавых прэпаратаў доктарам біялагічных навук Уладзімірам Макаравічам Шкуматавым.

— Уладзімір Макаравіч, ці ўдалося за год існавання вашай лабараторыі стварыць які-небудзь унікальны лекавы прэпарат?

— На жаль, стварэнне лекаў — не такі хуткі працэс, як хацелася б. Распрацоўкі новых тэхналогіяў могуць заняць многія гады. І ніхто не можа даць гарантыю, што нешта атрымаецца. Ад стварэння прэпарата да яго прамысловай вытворчасці — таксама доўгі шлях.

— А ў якіх накірунках вы ведзяце навуковыя распрацоўкі?

— Сярод прыярытэтных можна вылучыць тры. Першы — гэта выкарыстанне трансгенных мікраарганізмаў для сінтэзу біялагічна актыўных рэчываў, якія з'яўляюцца субстанцыямі лекавых прэпаратаў. У прыватнасці, гаворка ідзе пра стэроідныя гармоны, якія выкарыстоўваюцца для стварэння супрацьалергічных, супрацьшокавых прэпаратаў, кантрацэптываў.

Другі накірунак — атрыманне ў высокаачышчаным стане гідралітычных ферментаў, такіх, як амілаз, пратэаз, ліпаз, каб пасля выкарыстоўваць іх у замяшчальнай ферментатэрапіі — для лячэння страўнікава-кішэчных захворванняў. Прэпараты, якія зараз існуюць: "Фестал", "Панзінорм", — былі створаныя на аснове ферментаў з жывёльных крыніцаў. Ёсць жа тэхнічныя ферментныя прэпараты, якія атрымліваюць мікрабіялагічным спосабам. На жаль, яны ўтрымліваюць сумесь разнастайных рэчываў, якія нельга ўжываць. Мы ставім задачу распрацаваць тэхналогію высокаачышчаных ферментаў, якія з'яўляюцца аналагам жывёльных, каб пасля іх камбінаваць.

І, нарэшце, трэці накірунак — гэта распрацоўка тэхналогіі атрымання жыццёва важных бялкоў-ферментаў — фактараў згусання крыві, трамбалітычных ферментаў. Тут можа выкарыстоўвацца тэхніка малекулярнага кланіравання.

— Дарэчы, Уладзімір Макаравіч, наконт кланіравання. Вядома, што многія вядучыя краіны выступаюць супраць таго, каб вялася даследаванні ў гэтай сферы...

— Так, дзякуючы вульгарнаму тлумачэнню гэтай з'явы. Наогул, што такое кланіраванне? Гэта сапраўдная рэвалюцыя ў навуцы. Напрыклад, такі неабходны для хворых людзей інсулін атрымліваюць пры дапамозе мікраарганізмаў, якраз выкарыстоўваючы тэхніку малекулярнага кланіравання. Зараз пры дапамозе вельмі складаных маніпуляцыяў з'явіліся жывёлы з пэўнымі ўласцівасцямі, якіх няма ў прыродзе. Трэба сказаць, што гэты накірунак у навуцы — толькі ў пачатку свайго шляху. Я лічу, што ў такіх выпадках неабходна асцярожнасць і пэўны кансерватызм. Таму што аддалены вынік нават цяжка ўявіць.

— Уладзімір Макаравіч, якімі дасягненнямі ў вытворчасці лекавых прэпаратаў мы можам пахваліцца?

— Што да вытворчасці і наменклатуры, то дзякуючы намаганням айчынных вытворчасцяў, міністэрства аховы здароўя краіны ў аптэках зараз можна набыць практычна ўсё. Іншая справа за якую цану і якой якасці. Што тычыцца распрацоўкі новых сродкаў, то давайце будзем шчырымі. Дзесяць гадоў таму кіраўнікі розных ведамстваў правялі так званы "круглы стол", дзе пачалі абмяркоўваць пытанні перспектыўных лекавых сродкаў у Савецкім Саюзе. Там былі міністр медыцынскай прамысловасці, кіраўнікі Акадэміі навук СССР, міністр аховы здароўя, прэзідэнт Акадэміі медыцынскіх навук СССР, міністр хімічнай прамысловасці. І яны шчыра прызналіся, што мы страшэнна адсталі ў гэтай сферы па ўсіх накірунках. Вы думаеце, што за гэты час становішча выправілася?

Ва ўсім свеце сфера распрацоўкі лекавых сродкаў з'яўляецца прыярытэтнай. І аўтарытэт краіны часта вызначаецца тым, наколькі яна самадастатковая ў гэтай галіне. Я так разумею: чалавеку, па сутнасці, перш за ўсё важна, каб ён быў здаровы і каб было што есці.

— Хто яшчэ ў рэспубліцы займаецца распрацоўкай лекавых сродкаў?

— У Беларусі ёсць нацыянальная праграма лекавых сродкаў. Дарэчы, яе ўзначальвае акадэмік Нацыянальнай Акадэміі навук Фёдар Мікалаевіч Капуцкі, які загадвае Лабараторыяй фізічнай хіміі і мадыфікацыі цэлюлозы НДІ фізіка-хімічных праблем БДУ і ўжо шмат гадоў займаецца распрацоўкай лекавых прэпаратаў на аснове цэлюлозы. Праграма дазваляе нейкім чынам сістэматызаваць такія даследаванні ў краіне па розных накірунках: лекавыя прэпараты на аснове кампанентаў нуклеінавых кіслот (член-карэспандэнт НАНБ І. А. Міхайлапула), амінакіслот (акадэмік НАНБ У. С. Салдатаў), актыўна працуе ў галіне новых лекаў АТ "Белмедпрэпараты" (генеральны дырэктар доктар фармацэўтычных навук В. М. Царанкоў), Барысаўскі хімікафармацэўтычны завод (дырэктар В. В. Драніца) і шмат іншых арганізацый рознай ведамаснай прыналежнасці.

Я хачу адзначыць, што сам працэс стварэння лекавых прэпаратаў — вельмі дарагі. Калі, канешне, гаворка ідзе аб прынцыпова новых тэхналогіях, новых рэчывах. У былым Саюзе з яго вялікім навукова-тэхнічным патэнцыялам і эканамічнай магутнасцю, за выключэннем дзвюх-трох прыярытэтных, распрацовак амаль не было.

Але прынцыпова новых арыгінальных лекаў, якімі мог бы пахваліцца нават былы Савецкі Саюз, у нас не так шмат. Напрыклад, не існуе ніводнага эфектыўнага антыбіётыка, фермента нейрапентыду і г.д. з айчыннай "прапіскай".

Дарэчы, апошнія айчынныя Нобелеўскія прэміі ў гэтай галіне атрымалі Мечнікаў і Паўлаў.

Увогуле, мы моцна адсталі ў фундаментальных даследаваннях. Адставанне ў фундаментальных навуках: хіміі, фізіцы, біялогіі і г. д., дзе закладаюцца асновы прынцыпова новых рашэнняў, — відавочныя. Напрыклад, хтосьці 20 гадоў таму зрабіў у лабараторыі ў прабірцы якую-небудзь рэкамбінантную ДНК, разлічыў канфармацыю бялковых малекул, улічыў магчымасці каталізу, замяніў функцыянальныя групы, зыходзячы толькі з акадэмічных меркаванняў. Праз 10 гадоў — гэта ўжо прынцыпова новая тэхналогія.

У свеце ідзе працэс міжнароднай інтэграцыі ў сферы лекавых прэпаратаў. На сусветных рынках працуе не асобная краіна, а цэлыя міжнародныя канцэрны. Кожная краіна выбірае для сябе якую-небудзь спецыялізацыю ў залежнасці ад навуковых распрацовак у пэўнай галіне, сыравіннай базы і арыгінальных тэхнічных рашэнняў, якія дазваляюць рабіць прадукт больш танным і якасным. Астатняе, што патрэбна, закупляецца. Вядома ж, распрацаваць усе лекавыя сродкі немагчыма. Буйныя фірмы, канцэрны з вялікім патэнцыялам дазваляюць сабе мець асобныя даследчыцкія падраздзяленні. Напрыклад, канцэрн "Шэрынг" у Германіі выдаткоўвае на развіццё навукі да 10 працэнтаў прыбытку і мае ў сваім складзе тры добра аснашчаныя інстытуты толькі ў галіне лекавых сродкаў. Другі сектар навукі — універсітэцкі. За кошт дзяржаўных сродкаў вядуцца даследаванні, часта напрамую не звязаныя з прамысловай вытворчасцю. Даследаванні дзеля даследаванняў. Але, як высветлілася, такі навуковы пошук таксама апраўдвае сябе і часта прыводзіць да сапраўдных адкрыццяў. Універсітэцкім вучоным у заходніх краінах сапраўды працуецца больш вольна. Але яны і атрымліваюць у тры-пяць разоў менш, чым тыя, хто працуе ў буйных канцэрнах.

Зразумела ж, многія прэпараты ў рэспубліцы выраблюцца. Але ў свеце ёсць больш якасныя прадукты. Аднараз вая ін'екцыя дабраякасны растворам хвораму гемафіляй каштуе каля 500 долара У нас у рэспубліцы каля 60 чалавек пакутуюць на гэту хваробу. У Германіі лячэнне прафілактыка хворага на г мафілію абыходзіцца дзярж ве ад 300 тысяч да 1 мільё нямецкіх марак у год. Айчы ныя прэпараты, на жаль, не кія якасныя, як хацелася б.

А вось яшчэ адзін прэ рат. Калі ўвесці яго ін'екц на працягу першых этапаў р віцця інфаркту міякарда, х роба часта праходзіць д хворага амаль незаўваж Каштуе прэпарат таксама танна — 200 долараў за а дозу. Пералік можна пра ваць, так што ёсць над ч працаваць і вучоным, і прам ловасці.

Канешне, лепш не хвар Але задача дзяржавы ма мальна дапамагчы хвор чалавеку і даць магчыма набыць неабходныя лекі.

Гутар
Таццяна КУХАР

Вышэйшы паверх інтэграцыі

На пачатку лютага ў Маскве прайшла навукова-практычная канферэнцыя "Беларуска-расійскія адносіны: праблемы і перспектывы". У "круглым стале" прынялі ўдзел вучоныя Інстытута міжнародных і палітычных даследаванняў Расійскай акадэміі навук і Белдзяржуніверсітэта. Беларускі бок прадстаўлялі дэкан факультэта міжнародных адносін, доктар гістарычных навук, прафесар А. В. Шарапа, доктар юрыдычных навук, прафесар Ю. П. Броўка, доктар гістарычных навук, прафесар А. А. Чалядзінскі, доктар гістарычных навук, прафесар А. А. Разанаў, доктар гістарычных навук, прафесар В. Е. Снапкоўскі і выкладчык БДУ А. І. Гардзейчык.

Канферэнцыя прайшла ў знамянальны час, бо з заканчэннем 1997 года ў гісторыі Садружнасці незалежных дзяржаў закончыўся і розначасовы па сваіх праяўвах этап, які, выкарыстоўваючы літаратурны тэрмін, можна было б назваць "этапам рамантызму" — надзеяў, але не здзяйсненняў. Нарэшце ён саступіў месца перыяду прагматызму і рэальных спраў. І тут якраз паўсталі тыя пытанні, якія і абмяркоўвалі падчас сустрэчы беларускія і расійскія навукоўцы. Калі Садружнасці існаваць, дык якія формы яна павінна набыць не толькі для забеспячэння свайго далейшага існавання, але і для росквіту? Якія інтарэсы, глабальныя (геапалітычныя) ці рэгіянальныя (унутраныя) павінны з'яўляцца першаснымі? Якія павінны быць прыярытэты ва ўнутранай ці знешняй палітыцы краінаў СНД?

У некаторай ступені на пытанні аб далейшым лёсе СНД дае адказы Саюз Беларусі і Расіі. Як трапна падкрэсліў прафесар Аляксандр Віктаравіч Шарапа, "адносіны паміж нашымі краінамі ўяўляюць сабой вышэйшы паверх таго агульнага будынку, які называецца "інтэграцыя краін СНД", крыху ніжэй — паверх чатырох краін Садружнасці: Расіі, Беларусі, Казахстана і Кіргізіі, — якія заключылі паміж сабой пагадненне аб паглыбленні інтэграцыі ў эканамічнай і сацыяльнай сферах. Падмуркам жа ўсяго будынка з'яўляецца супрацоўніцтва паміж усімі дванаццаццю краінамі СНД — як шматбаковае, так і двухбаковае".

Здаецца, па-за ўвагай удзельнікаў "круглага стала" не засталася ні адна праблема беларуска-расійскіх адносінаў: і гісторыка-культурныя, і ваенна-палітычныя, і міжнародна-прававыя аспекты яднання.

А што датычыць перспектыў Саюза, дык, каб былі яны ўражлівымі, палітыкам не зашкодзіла б прыслухацца да прапаноў навукоўцаў.

Зінаіда МАРАВА

З гісторыяй на "ты"

Гэты дзень у жыцці універсітэта

10.02 — 75 гадоў з дня адкрыцця першай хірургічнай клінікі пры БДУ.

15.02 — 70 гадоў з часу, як СНК БССР зацвердзіў праект пабудовы універсітэцкага гарадка. Праект прадугледжваў будаўніцтва больш чым 16 аб'ектаў: галоўны аўдыторны, анатамічны, бібліятэчны, астранамічны карпусы, тэрапеўтычная і хірургічная клінікі. На будаўніцтва выдаткоўвалася 6,5 млн. рублёў.

15.02 — 120 гадоў з дня нараджэння Пятра Маўрадыядзі (1878-1933гг.), беларускага навукоўца-заолага. Ён скончыў Наварасійскі універсітэт. З 1923 па 1930 гг. працаваў загадчыкам кафедры гісталогіі і біялогіі медыцынскага факультэта БДУ, а потым Мінскага медінстытута.

16.02 — 35 гадоў з дня пачатку заняткаў на факультэце грамадскіх прафесіяў па спецыяльнасцях: хормайстар, кіраўнік танцавальнага калектыву, дырэктар аркестра народных інструментаў, рэжысёр самадзейных і драматычных тэатральных калектываў.

18.02 — 75 гадоў з дня выдання першага часопіса рабфака "Чырвоны студэнт".

18.02 — 105 гадоў з дня нараджэння Максіма Гарэцкага (1893-1938 гг.), класіка беларускай літаратуры, празаіка, фалькларыста, літаратуразнаўцы. З кастрычніка 1923 года выкладаў беларускую мову і літаратуру на рабфаку БДУ. Расстраляны 10.02.38. Рэабілітаваны ў 1957 годзе.

22.02 — 95 гадоў з дня нараджэння Антона Сеўчанкі (1903-1978 гг.), беларускага фізіка. У 1953 годзе ён стаў доктарам фізіка-матэматычных навук, прафесарам і акадэмікам АН Беларусі. У 1971 годзе — Героем Сацыялістычнай працы.

У 1932 годзе Антон Нічыпаравіч скончыў БДУ, а ў 1957 годзе стаў рэктарам гэтай навучальнай установы. З 1972 года — дырэктар НДІ ПФП БДУ.

Рубрыку вядзе Артур ЗЕЛЬСКІ, загадчык музея гісторыі БДУ

Паштовая скрыня

Алесь — руплівы студэнт

Яшчэ ў дзяцінстве Алесь Шалахоўскі не задумваўся, куды пайсці пасля школы — толькі ў калыску беларускай навукі і асветы — Белдзяржуніверсітэт. І толькі на гістарычны факультэт.

Бацькі яго былі далёкімі па адукацыі ад гісторыі, так што ў выбары сваёй будучай спецыяльнасці ён ішоў ад сябе.

Як вучыўся Алесь Шалахоўскі ў школе № 16 г.Мінска? Няблага. Сярэдні бал пасля яе заканчэння быў роўны 4,5. Паспяхова здаў экзамены ў БДУ і вось 5 год крочыць з прыступкі на прыступку па граніту гісторыі. Але быць гісторыкам Алесю мала, і ён становіцца журналістам. Прозвішча Шалахоўскага бачыў я ў такіх элітных выданнях, як "Літаратура і мастацтва", "Культура", "Кніга і мы", газетах "Кніжны свет", „Молодежный курьер" (г. Гродна) і іншых. Асвоіў ён і не адзін пляц на Беларускім радыё: я з цікавасцю і захапленнем слухаў неяк яго перадачу з Мінска, прысвечаную гісторыі Магілёўскага медыцынскага вучылішча. А мастацтву дыктарскай працы ён навучаўся на курсах, якія вяла сама Наталля Сцяжко.

Навучанне на 5-м курсе БДУ, занятак журналістыкай — ці ўсё гэта? Не, ён яшчэ выкладае гісторыю ў школе-ліцэі № 16.

Дзе ж сышліся мае і Алеся Шалахоўскага сцяжынкі? Ён цікаўны з дня нараджэння. Гартаючы старонкі газеты „Во славу Родины", студэнт-гісторык звярнуў увагу на шматлікія мае матэрыялы пад рубрыкай "Белая Русь: архівы часу", у "Чырвонай змене" на публікацыі пад агульнай назвай "Сто артыкулаў з гісторыі Беларусі", а таксама на мае гістарычныя нарысы ў часопісе "Беларуская думка". У адной з рэдакцый узяў мой адрас і напісаў вялікі ліст. Так мы і пазнаёміліся.

Алесь Шалахоўскі, як раней і я, „улез" у недаследаваную дзялянку сведчанняў пра паэта Паўлюка Багрыма.

А зараз Алесь стварае цыкл гістарычных партрэтаў. Што ж, гэта цікава! Адзін ужо пад назвай „Рихтер назвал его своим другом" з'явіўся ў „Мінскай праўдзе". Гэта аповед пра музыказнаўцу і дыктара Уладзіміра Аляксеевіча Шаліхіна. І мы пажадаем маладому даследчыку, студэнту, настаўніку натхнення і плёну!

Міхась МАЛІНОЎСКІ, г. Баранавічы

Твае выкладчыкі, універсітэт

Віншуем, Ганна Натанаўна!

7 студзеня 1998 года Ганне Натанаўне Нахімоўскай споўнілася 90 гадоў. Усё яе жыццё звязана з Белдзяржуніверсітэтам. Ужо праз тры гады пасля стварэння БДУ ў 1924 годзе Г.Н.Нахімоўская стала студэнткай фізмата і скончыла універсітэт у 1928 годзе. Потым яна навучалася ў аспірантуры пры АН БССР, затым працавала выкладчыкам матэматыкі ў БДУ і БПІ.

Падчас Вялікай Айчыннай вайны з 1941 года па 1943 працавала выкладчыкам Пензенскага педінстытута, затым дацэнтам БДУ, які быў адноўлены на станцыі Сходня Маскоўскай вобласці.

У 1944 годзе Г.Н. Нахімоўская абараніла кандыдацкую дысертацыю, у якой атрымала цікавыя вынікі па лакальных укладах рыманавых метрык у еўклідавай прасторы. Праз два гады атрымала званне дацэнта, узнагароджана медалём "За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 гг."

Пасля вайны Ганна Натанаўна працавала загадчыцай кафедры геаметрыі БДУ, а затым, пакуль не выйшла на пенсію ў 1970 годзе, дацэнтам гэтай кафедры, чытаючы курсы аналітычнай і дыферэнцыяльнай геаметрыі, асноваў геаметрыі, тэнзарнага аналізу.

Навуковыя інтарэсы Г.Н.Нахімоўскай звязаны з праблемай пагружэння рыманавых прастораў у еўклідавыя, а таксама з тэорыяй крывых і паверхняў у прасторы Лабачэўскага.

Сотні выпускнікоў фізмата і мехмата БДУ з удзячнасцю ўспамінаюць педагога і матэматыка Г.Н.Нахімоўскую.

Жадаем Ганне Натанаўне добрага здароўя і доўгіх гадоў жыцця.

А.А. БУРДУН, А.А. ГУСАК, К.Д. ЛУКІН, В.І. ПЛАТОНАВА, А.С. ФЕДЗЕНКА, К.С. ФІЛІПОВІЧ, Р.П. ХАЦКЕВІЧ, Н.І. ЮРЧУК, В.І. ЯНЧЭЎСКІ

Служба 01

Не рызыкуйце сабой і іншымі

Яшчэ многія людзі жывуць надзеяй на "а раптам". На чужых памылках вучыцца мы не любім. Больш за палову ўсіх трагедыяў адбываецца праз нашую нядбайнасць і няўважлівасць.

У гэтым годзе ізноў паўстала знаёмая праблема з узнікненнем пажараў — курэнне ў ложку ў нецвярозым стане.

Так, 9 студзеня грамадзянін Г., які жыве па праспекту Жукава, 21, прыйшоў увечары дадому крыху выпіўшы. Лёг адпачыць, пры гэтым вырашыў перад сном крыху пасмаліць. Але ён быў адзін, хутка заснуў, недапалак застаўся непагашаны.

Калі б не суседзі, якія своечасова выклікалі пажарных, вынік мог быць вельмі сумным.

Не прайшло і тыдня, як 14 студзеня ў жылым доме па вуліцы Лермантава, 20, адбыўся аналагічны пажар. Токар С. у нецвярозым стане заснуў з цыгарэтай у руцэ. Суседзі паведамілі ў пажарную толькі тады, калі з кватэры на вуліцу пайшоў дым. Пажарныя ўсё пагасілі, але гаспадара кватэры, на жаль, выратаваць не ўдалося.

А ўсё ж проста — не кідайце непагашаныя акуркі альбо запалкі з балконаў і лоджый, не курыце ў ложку, не пакідайце без догляду ўключаныя ў сетку электрапрыборы, не захоўвайце на балконе гаручыя рэчывы і матэрыялы, не пакідайце ежу на пліце без догляду, не карыстайцеся самапальнымі абагравальнікамі.

Вось гэтая невялікая колькасць парадаў, якія дапамогуць не рызыкаваць сваім жыццём і жыццём тых, хто побач з вамі.

Валерый РОСЛІК, інспектар АУПС-9 Маскоўскага раёна

ДАІ паведамляе

Цішэй едзеш — здаравейшым будзеш

У студзені на дарогах Маскоўскага раёна вадзіцелі і пешаходы не палепшылі дысцыпліну.

Працягваюцца парушэнні правілаў дарожнага руху. Калі ў мінулым годзе за той жа тэрмін выяўлена 6214 парушэнняў ПДР, дык за студзень 1998 — 8220. З іх за перавышэнне ўстаноўленай хуткасці затрымана 950 вадзіцеляў, за кіраванне транспартам без праў — 105, за паездкі па дарогах у нецвярозым стане — 72.

Аштрафавана ўсяго 5104 вадзіцелі, у тым ліку тыя, хто ехаў на асабістым транспарце, 4131. Пазбаўлены праў 25 чалавек.

Пешаходы на пачатку новага года таксама не "адпачывалі", але колькасць іх парушэнняў амаль не перавысіла мінулагоднюю лічбу — 2401 (у студзені 1997 года — 2382). Сярод парушальнікаў правілаў дарожнага руху ёсць і студэнты БДУ. Сяргей Лукашэвіч кіраваў аўтамабілем без вадзіцельскіх праў, Дзмітрый Казак здзейсніў дарожна-транспартнае здарэнне.

Гавораць, у маладосці не вельмі цэняць жыццё, таму што проста не ўяўляюць, што яно можа абарвацца ў любы момант. Мы ж нагадваем, што клапаціцца аб уласным здароўі патрэбна пачынаць з юнацкага ўзросту. Тым больш, што пры дарожна-транспартных здарэннях заўсёды пакутуюць і тыя, хто трапіў у іх не па ўласнай віне.

Мікалай СКІПАР, дзяржаўтаінспектар Маскоўскай ДАІ

Здароўе

Каб зубы былі моцнымі...

Магчыма, ад шматлікіх надакучлівых размоў пра здаровыя і моцныя зубы вы адразу адчуваеце зубны боль. Але сёння мы пагаворым аб дзіўнай ролі, якую выконвае незаўважны элемент поласці рота — сліна. Яе важнасць найлепшым чынам спазналі тыя людзі, у якіх слінны сакрэт практычна не паступае ў поласць рота. Менавіта сліна дазваляе нам атрымліваць асалоду ад ежы, стымулюючы смакавыя рэцэптары на паверхні языка. Калі мы гаворым і дыхаем, мяккія тканкі нашага рота, губляюць вільгаць, якую аднаўляе сліна. Падчас фізічнай нагрузкі арганізм таксама страчвае неабходную для яго існавання вільгаць. Адчуванне сухасці ў роце — гэта сігнал аб тым, што нашаму арганізму не хапае вадкасці. Адным са свойстваў сліны з'яўляецца тое, што яна робіць вільготнай ежу. Без гэтага яе немагчыма было б праглынуць. Пад уздзеяннем сліны пачынаецца працэс стрававання. Сліна да таго ж з'яўляецца прыроднай змазкай для нашых зубоў і дзяснаў, ахоўвае іх ад зношвання. Толькі дзякуючы яе дэзінфіцыруючым рэчывам у ротавай поласці чалавека адбываецца ахова ўсяго яго арганізма ад бактэрыяў і вірусаў.

Сліна дапамагае нашым зубам захаваць важныя мінеральныя рэчывы. Таму што развіццё карыесу пачынаецца з паяўлення кіслаты ў зубным налёце. Уздзейнічаючы на зуб, кіслата можа растварыць кальцый і фасфаты ў яго эмалі. Карыесагенны ўзровень РН можа дзейнічаць на працягу дзвюх гадзін, асабліва ў міжзубных зонах. Даказана, што менавіта сліна ўздзейнічае як натуральная ахоўная сістэма арганізма, нейтралізуючы кіслоты і паляпшаючы выдаленне рэшткаў ежы з гэтых участкаў. Таму стымуляванне слінаадзялення дапамагае правесці прафілактыку карыесу.

Стаматалагічныя даследаванні жавальных гумак пацвердзілі, што калі жаваць тыя з іх, што не ўтрымліваюць цукру на працягу дваццаці хвілін пасля яды, РН зубнога налёту аднаўляецца. Аднак не трэба карыстацца жавальнымі гумкамі паміж прыёмамі ежы і забываць пра даўно вядомыя метады прафілактыкі карыесу.

Н.П. КУДЗЕЛКА, заг. стаматалагічнага аддзялення студэнцкай паліклінікі

Пакінутыя без абеду, альбо Фемінізм не спіць!

Дзень Святога Валянціна, які свет адзначыць 14 лютага, многія беларусы не лічаць за свята. Шкада. Бо менавіта яно нагадвае кожнаму з нас, што побач заўсёды знойдзецца той, каго можна пакахаць. Ці ўжо знайшоўся. Самым закаранелым песімістам мы раім, прачытаўшы гэтую рубрыку, азірнуцца навокал.

Ад кахання не схавацца

Самая непрадказальная рэч у свеце — каханне. Спецыфіка яго ў тым, шо ніколі не ведаеш, калі яно прыйдзе. Асабліва пакутуюць ад гэтага навучэнцы ВНУ. Толькі намерыцца студэнт узяцца за розум — каханне прыйшло. І зноў усе справы адыходзяць на другі план. І бегаеш ты са сваім каханнем, пестуеш, як дзіцёнка, абдзьмухваеш з усіх бакоў хваробу сваю невялічкую (цяжка, калі не ў час прыйшла, але яшчэ цяжэй будзе, калі не ў час пакіне).

Аднаму матэматыку не пашанцавала — закахаўся якраз перад сесіяй. Закінуў усё, не здаў аніводнага экзамена (узаемнае каханне было). І што ж вы думаеце? Выключылі з ВНУ — і каханне як рукой зняло, праўда, у дзяўчыны.

А ўвогуле, каханне заканчваецца „на розных этапах свайго развіцця" па-рознаму. Часцей за ўсё, вынік залежыць ад саміх закаханых...

Станоўчы

У гэты раз Юля пазнаёмілася тут з цэлай кампаніяй маладых хлопцаў і дзяўчат. На Яўгена яна не звярнула ўвагі. Дый ён не праяўляў вялікай зацікаўленасці. Затое з Сяргеем яны адразу знайшлі агульную мову. Прыгожы, вытрыманы, але вясёлы — Юля ў які ўжо раз здзівілася інтуіцыі сваёй сяброўкі Таццяны, а галоўнае, яе шанцаванню на людзей.

Сяргей запрасіў яе на канцэрт, і Юля згадзілася з радасцю.

А праз месяц пайшла блытаніна. Калі бліжэй знаёмішся з людзямі, пераглядаеш свае да іх адносіны. І Юля зразумела, што закахалася ў Яўгена.

Яны хадзілі на розныя вечары ўсе разам, і Юлі было цяжка быць да Яўгена абыякавай. Той, як назло, пачаў звяртаць на яе ўвагу. Юля не ведала, як сябе павесці. Нарэшце, перастала сустракакацца з Сяргеем. Здавалася, цяпер нішто не перашкаджала Яўгену патэлефанаваць. Але ці то тэлефон у Юлі не спрацаваў, ці то хлопец быў вельмі заняты...

Юля ўжо шкадавала, што кінула Сяргея. Усе яе перажыванні былі дарэмныя, і гэта прыгнятала больш за ўсё...

Адмоўны

Ала не прымусіла сябе шукаць. Кожны тыдзень запрашала Аляксандра на дзень нараджэння: то бацьку 50 споўніцца, то дзядзьку. Праўда, час ад часу, яе бянтэжыла думка аб тым, што Саша думае пра такія неверагодныя супадзенні. Аляксандр, канешне, падазраваў, што родныя Алы нараджаліся не два разы ў год, але толькі моўчкі згаджаўся прыйсці павіншаваць імянінніка.

Праз паўгода, калі ў ЗАГС была пададзена заява, да Алы прыйшла Сашына маці: „Вы нам не падыходзіце. Не ведаю, чым яго вабіць такая дзяўчына, але гэта абавязкова пройдзе. І не трэба яму тэлефанаваць!".

Паўгода націску з боку родных былі невыноснымі. Усе глядзелі на яго, спачувальна хлопалі па плячах: „Ну, нічога, гэта пройдзе". Некалькі разоў Саша сыходзіў з дому. Але сынам быў паслухмяным. І „ўсё стала на свае месцы".

Праз год Ала вышла замуж за ваеннага. Знайшлі жонку і для Сашы.

В.А.

Не сакрэт, што „слабая палова" Еўропы кінулася ў фемінізм. Смелыя дзелавыя жанчыны імкнуцца самі вырашаць свой лёс і залежнасць ад мужчын лічаць абразай (нават калі гэтыя мужчыны проста дапамагаюць несці цяжкія сумкі).

А вось нашая моладзь, як высветлілася, ва ўсім прытрымліваецца сучасных поглядаў. Мы прайшліся па факультэтах з пытаннем аб жаночай эмансіпацыі і не знайшлі ніводнай феміністкі, што проста ненатуральна (можа, не тыя трапляліся?).

Большасць дзяўчат адказвала, што ім абыякава, хто іх будзе забяспечваць, абы забяспечваў. А да фемінізму яны ніяк не ставяцца, бо выгадней падлашчыцца да каханага і атрымліваць што трэба,чым дамагацца ўсяго сваімі сіламі. Дый у выпадку здрады каханага дзяўчаты аддаюць перавагу маўклівай апатыі.

Падчас гутаркі з моцнай паловай студэнцтва, мы натрапілі на сцяну непаразумення:

— Да фемінізму? Не ведаю. Здаецца, добра стаўлюся. А што гэта такое?

Як бачым, спецыфіка нашай моладзі ў тым, што дзяўчаты ведаюць, але не ставяцца, а хлопцы ставяцца, але не ведаюць.

(Для тых, хто не ведае: фемінізм — палітычны рух за ўраўнаванне жанчын у правах з мужчынамі).

Выключэннем быў факультэт журналістыкі — сапраўдны прытулак як для фемінізму, так і для яго ворагаў.

У якасці прыкладу друкуем „перакрыжаванае" інтэрв'ю з прадстаўнікамі двух супрацьлеглых поглядаў на жаночую эмансіпацыю (Машай і Сержам).

1. Б.У.: Маша, ці лічыце Вы сябе феміністкай?

М.: Так!

С.: Глупства.

2. Б.У.: Ці адчуваеце Вы сваю няроўнасць у параўнанні з мужчынамі?

М.: Так!

С.: Ну, і ідзіце сабе шпалы цягаць.

М.: Я не аб гэтым. Мы і зараз іх цягаем. А ўсё прагрэсіўнае насельніцтва Еўропы прыйшло да таго, што жанчыны ў сенатах сядзяць. Мы таксама пойдзем гэтым шляхам. І, магчыма, у бліжэйшай будучыні займем высокае месца, на якім цяпер сядзяць мужчыны.

3. Б.У.: Ці лічыце Вы сябе разумнейшай за мужчын?

М.: Безумоўна. Мужчыны — ніжэйшыя істоты, а жанчыны — вышэйшыя.

С.: А чаму ж вы хочаце заняць іх месца?

М.: Мужчыны займаюць нашае месца. А мы займаем не вартае нас (нізкае).

4. Б.У.: Вы паказваеце мужчынам сваю разумовую перавагу ці пільна ўтойваеце гэта?

М.: Я не задумвалася над тым, што павінна ўтойваць. Што думаю, тое і кажу; што кажу, пра тое і думаю.

С.: Што цвярозы мысліць, п'яны скажа.

М.: Я не п'ю!

5. Б.У.: Ці ліслівіце Вы перад мужчынамі?

М.: У залежнасці ад мэты.

С.: А што Вы будзеце рабіць, калі Вашая абаяльнасць знікае ў сувязі з дасягненнем мэты (роўнасці з мужчынамі)?

М.: А хто сказаў, што яна знікае? Яна трансфармуецца.

6. Б.У.: „Мужчына" — гэта гучыць горда?

М.: Гэта гучыць бязглузда.

7. Б.У.: Вы будзеце трымаць свайго мужа ў руках?

М.: У кіпцюрах!

С.: Бедны хлопец. А ў цябе ён ёсць?

М.: Пытанне было патэнцыяльным. Спачатку паглядзім, які трапіцца муж.

8. Б.У.: У Еўропе жанчыны часцей ствараюць сям'ю пасля 30 год. У колькі Вы лічыце неабходным выйсці замуж?

М.: 30 — ідэальны ўзрост (я кажу пра сям'ю).

С.: Каму вы будзеце патрэбны ў гэты час?!. Феміністкі!..

9. Б.У.: Калі Вам зараз зробяць прапанову, пойдзеце?

М.: Не.

Б.У.: А кінеце дзеля каханага навучанне?

М.: Не.

Б.У.: А калі ён будзе супраць, каб Вы ішлі ў аспірантуру?

М.: Пайду! (Хаця я ўвогуле не збіралася, але ў такой сітуацыі пайду).

Б.У.: А калі любага раздражняе Вашая ўпартасць?

М.: Пакіну яго без абеду (хаця я ў кожным выпадку не ўмею гатаваць).

С. (выходзячы з комы): Навошта табе муж?!

М.: Дзеля дзяцей. Каб дапамагаў грашыма і выхоўваў нашчадкаў. Усё ж такі аліменты мужа не заменяць (у сэнсе дапамогі).

10. Б.У.: Што Вы зробіце, калі каханы Вас абразіць?

М.: Зняважу яго ў адказ.

С.: Аднак, тэндэнцыя!..

11. Б.У.: Ваша стаўленне да абортаў?

М.: Я супраць іх. Па-першае, таму што мы выміраем як нацыя. Па-другое, лічу, што аборт — забойства. Але я супраць іх забароны, бо ўсё роўна будуць, толькі гарантыі бяспекі здароўя ў падпольных умовах ніхто не дасць.

12. Б.У.: А Ваш погляд на курэнне і п'янства з боку жанчын?

М.: Я не куру — у мяне алергія на тытунь. Што датычыць п'янства — я не п'ю, бо люблю забаўляцца, назіраючы за п'янымі.

13. Б.У.: А Вы дзяцей, увогуле, заводзіць збіраецеся?

М.: Канешне! Хлопчыка і дзяўчынку.

С. (з'едліва): І чаму ж раптам хлопчыка?

М.: Дзеля разнастайнасці.

14. Б.У.: Хто, па-вашаму, павінен выхоўваць дзіця?

М.: І бацька, і маці.

С.: Таму што калі выхоўваюць жанчыны ...

М.: Таму што калі выхоўваюць мужчыны, атрымліваюцца маральныя выродкі.

С.: Цытата: „Дети, которых воспитывали отцы ..."

М.: „... умирают во младенчестве".

С.: „... — самые лучшие дети!"

15. Б.У.: Дык ці павінны быць роўнымі мужчына і жанчы-на?

М.: Для пачатку гэта патрэбна як мінімум. У якасці маскімуму я прадбачу знішчэнне мужчын як біялагічнага віду.

16. Б.У.: Серж, ці падабаюцца Вам такія дзяўчаты?

М.: Адказвай шчыра!

С.: Мне падабаюцца жанчыны, як ідэал прыгажосці, а не ...

М.: У цябе скажонае ўспрыняцце фемінізму.

17. Б.У.: Ці хацелі б вы мець разумную жонку, феміністку?

С.: Разумную — канешне. Што датычыць фемінізму, то ён і розум — несумяшчальныя.

М.: Фемінізм — вышэйшая ступень духоўнай, маральнай і інтэлектуальнай дасканаласці жанчыны. І мужчыны таксама.

С.: А інтэлект вы паставілі на апошняе месца!

На гэтым мыскончым гутарку, бо, здаецца, асноўнае больш-менш высветлена. Спадзяемся, што пасля азнаямлення з рознымі ідэйнымі пазіцыямі Вы зрабілі высновы і абдумалі свае далейшыя крокі ў стаіленні да фемінізму.

В.АЎСЯНІК

Спортпляцоўка

"Мы не маглі падвесці сваіх прыхільнікаў..."

Аляксей Цітавец — выхаванец мінскай хакейнай школы „Юнацтва". Гуляе за каманду з такой жа назвай з 1995 года. Удзельнік чэмпіяната Еўропы сярод юнакоў у групе А. Чэмпіён свету сярод моладзі ў групе В. Жыццё Аляксея на факультэце журналістыкі, дзе ён вучыцца, — таямніца.

— Чаму так атрымалася?

— Я не вельмі камунікабельны. Калі адчуваю, што гэта мой чалавек, мы сыходзімся, калі не — паміж намі захоўваецца адлегласць. Таму ў мяне няшмат сяброў. Пераважна — знаёмыя.

— І таму Вы ходзіце на факультэце заўсёды сур'ёзны, часта адзін і амаль не ўсміхаецеся?

— (Сумеўшыся). Усміхаюся я сапраўды рэдка. А пра астатняе нават і не ведаю, што адказаць. Ніколі за сабою нічога такога не заўважаў. Але гэта ні ў якім разе не зорная хвароба.

— А калі ўсё ж пагаварыць пра хакейныя поспехі...

— Расказаць, як маладзёжная зборная заваявала золата?

— Так, але лепш пачаць з юнацкай.

— Пра юнацкі чэмпіянат Еўропы, што праходзіў у 1996 годзе ў Уфе, распавядаць асабліва няма чаго. Мы праігралі ўсе матчы і вымушаны былі развітацца з групай А. Вельмі ўжо моцныя трапілі сапернікі. Таму нас ніхто ні ў чым не абвінавачваў, але ў глыбіні душы застаўся вельмі непрыемны асадак. Затое чэмпіянат свету ў Польшчы мы чакалі як магчымасць рэабілітавацца.

— Але знаходзіліся людзі, якія не вельмі верылі ў моц нашай маладзёжнай зборнай...

— Чуліся розныя выказванні. Некаторыя бачылі нас ўжо па-за групай В. А мы, не прыслухоўваючыся ні да каго, марылі перамагчы, каб давесці ўсім, што мы чагосьці вартыя.

— Трэба адзначыць, што зборнай Беларусі вельмі „пашчасціла" з сапернікамі па падгрупе.

— Украіна, Нарвегія, Польшча — нас ахрысцілі падгрупай смерці. Тры лепшыя каманды сталі прызёрамі чэмпіянату. Мне як абаронцы не заўсёды ёмка было разбірацца з украінскімі нападаючымі. Не люблю гуляць супраць маленькіх і шустрых. А палякі наогул лічыліся фаварытамі турніру. Перад імі стаяла адна задача: перамога ў кожным матчы. Менавіта з імі першы матч гуляла зборная Беларусі. Першы перыяд скончыўся 1:0 не ў нашу карысць. Але ўсю нашую каманду да апошняга чалавека аб'ядноўвала адна мэта — перамагчы. Магчыма, мы больш імкнуліся да перамогі. У другой дваццацімінутцы закінулі дзве шайбы, а пасля яшчэ дзве. Вельмі выбіваў з каляіны поўны стадыён, які скандзіраваў: "Польшча! Польшча!". Але як было прыемна знайсці на трыбунах чалавек пяцьдзесят з беларускімі сцягамі. Мы не маглі падвесці сваіх прыхільнікаў.

— Але нарвежцаў назаўтра адолець усё ж такі не змаглі...

— Нават не ведаю, як гэта растлумачыць. Да таго Нарвегія праіграла 1:8 Украіне. Восем прапушчаных шайбаў для турніру такога ўзроўню — гэта зашмат. Камусьці можа падацца, што сапернік быў слабы. Але менавіта ў такіх выпадках вельмі цяжка настроіць сябе на гульню. Тым больш, што мы не паспелі як след прыйсці ў сябе пасля палякаў. Таксама адчувалася і прыхільнасць суддзі да нарвежцаў, праўда, і ў нас гульня не пайшла. А пасля дня адпачынку нас чакала зборная Украіны. Ну, і нервовая гульня ж была.

— Чаму нервовая?

— Для выхаду ў фінал нам бы хапіла і нічыёй. Але Украіна... Камандам у фінале залічваліся гульні, што правялі фіналісткі паміж сабой ў падгрупе. Украінцы праігралі палякам, прычым палякі, гульня якіх пачыналася пазней за нашу, верагодней за ўсё выйграюць у нарвежцаў. Таму, каб мець больш шанцаў на перамогу ў турніры, украінцам трэба браць у нас два ачкі. Спачатку яны павялі, пасля мы дзве шайбы закінулі, пасля яны яшчэ адну. Напрыканцы матча ні яны, ні мы не трапілі ў пустыя вароты. (Уздрыгнуў). Мы хацелі, каб хутчэй усё скончылася.

На фотаздымку: Аляксей ЦІТАВЕЦ (справа).

— А пасля — першая фінальная гульня супраць зборнай Венгрыі?

— Венгры — пераможцы другой групы. У іх вельмі моцны варатар, але нам пашчасціла. Першы гол мы забілі даволі кур'ёзны, і галкіпер зламаўся. Ну, мы і накідалі яшчэ сем.

— Пасля на вашым шляху паўсталі латышы...

— Гэта матч — за першае месца, бо апошняя гульня амаль нічога не вырашала. Латышы гарэлі жаданнем перамагчы нас. Але і мы гарэлі жаданнем іх абыграць. Карацей кажучы, перамаглі мы іх — 3:1. І ў нас засталіся адны французы...

— ... якія далі вам бой.

— Вы мяркуеце па ліку 5:4. Але за тры хвіліны да канца трэцяга перыяда мы вялі пяць адзін. А пасля крыху раслабіліся. Калі мы патрацілі столькі сіл і засталося зрабіць апошні крок, мы не маглі праваліцца. Хацелі прыгожа скончыцьь гэты турнір.

— Пасля ўсіх праведзеных гульняў Уладзімір Мікалаевіч Мелянчук, галоўны трэнер маладзёжнай зборнай Беларусі, сказаў, што яго прыемна здзівіла гульня звязкі абаронцаў Цітавец — Тоўсцік.

— Было б горш, калі б мы яго здзівілі непрыемна. Не скажу, што мы гулялі выдатна. Вельмі цяжка гуляць, калі кожны эпізод штосці вырашае. Мы стараліся.

— Вашыя асабістыя дасягненні на турніры?

— Адна перадача і чатыры хвіліны штрафу.

— Даволі дзіўна бачыць ў Вас толькі чатыры хвіліны штрафу.

— Вы успамінаеце пра маё другое месца сярод штрафнікоў у мінулым чэмпіянаце УЕХЛ? Тады я некалькі разоў да канца матча сядзеў. Пакрысе пазбаўляюся ад дурных звычак. Хакеісты, наогул, людзі не грубыя.

— А як жа вядомыя хакейныя патасоўкі?

— У запале барацьбы ствараецца ўсякае, але ўсе эмоцыі мы пакідаем на катку. Можаце мне паверыць, у жыцці хакеісты вельмі спакойныя.

— А што вас можа раззлаваць, вывесці з сябе?

— Калі мне двойчы наступяць на нагу. (Смяецца) Калі ў метро прад'яўляю залікоўку замест студэнцкага білета, а на мяне пачынаюць крычаць. Цяжка тады стрымацца і не адказаць на павышаных танах, але не больш за тое.

Вольга КАЗДЗЕРКА

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Заснавальнік газеты - БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.

Газета надрукавана на паліграфічнай фабрыцы "Чырвоная зорка" ВПП імя Я. Коласа. 220079, г. Мінск, 1-ы Загарадны завул., 3 Ум. друк. арк. 1 Падпісана ў друк у 12.00

12 ЛЮТАГА Зак. 1430 Т. 1000 экз. Бясплатна

Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 9, паверх 4, пакой 411, тэлефон 2206827.

Рэдактар М. Г. ЗАГОРСКАЯ

Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР